52 местечковыя и 29 городских Советов. Политику Москвы по отношению к национальным республикам после образования СССР следует признать достаточно взвешенной. Партийным организациям предписывалось «считаться» с национальными интересами и даже с националистическими настроениями, поскольку они захватывают широкие народные круги. В этом административно-территориальном делении БССР нашлось место национальным Советам. В 1924 г. в республике насчитывалось 9 национальных Советов, в дальнейшем число национальных Советов увеличивалось. В 1928 г. в БССР имелось 23 еврейския, 19 польских, 16 русских, 5 латышских, 2 украинския и 2 немецкие Советы. С этого времени начался процесс выравнивания уровня экономического и культурного развития народов СССР. Конечно, за короткое время, в течение одного поколения осуществить «Выравнивание наций», как это было изначально задумано, не удалось. Требовался несравненно больший срок.

**Заключение.** Подводя итог вышеизложенному, отметим: после Октября 1917 г. национально-государственное строительство в Беларуси встретилось с серьезными трудностями. Борьба междусторонники создания самостоятельного белорусского государства и их оппонентаминосила острый характер. Самоопределение белорусского народа в форме самостоятельной и суверенной советской республики произошло в результате деятельности прогрессивной политической элиты и народной поддержке. Оно стало итогом логического развития процесса национального движения в бывшем Северо-Западном крае. Реализации идеи национальной государственности, явилось высшей точкой политического, социально-экономического и культурного развития белорусского этноса, что приобретает чрезвычайно важное значение для современной Республики Беларусь.


1. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). - Фонд 325. -Оп.1. - Д. 194.
2. РудовичС. Час выбару: праблема самавызначэння Беларусі ў 1917 годзе.Мінск, 2001.
3. Сташкевич Н.С. Приговор революции: крушение антисоветского движения в Белоруссии (1917 – 1925). Мн., 1985.
4. История белорусской государственности. В 5 т.Т.3. Белорусская государственность: от идеи к национальному государству (1917 -1939) / А.А. Коваленя [и др.] отв. ред. тома: В.Г. Мазец, Н.В. Смехович, С.А. Третьяк; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. -Минск: Беларуская навука, 2019.
5. НАРБ.-Фонд 4.-Оп.21.-Д.25.
6. Кастрычнік на Беларусі: Зб. Арт.і дакументаў. Мінск,1927.
7. Краўцоў М. Рада Беларускай Народнай Рэспублікі. Вільня,1920.
8. Лойко Л. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка // Энцыкл. гіст. Беларусі: у 6 т. Мінск,1993.Т.1: А – Беліца.
9. Мандрык, І. У.Гісторыя Беларусі для спецыяльнасці 1-02 01 01.:вучэбна -метадычны комплекс / І.У.Мандрык. – Віцебск: ВДУ імя П.М.Машэрава, 2018.1
10. Государственный архив Витебской области (ГАВО). Фонд 123. - Оп.1,-Д.1116.


## ДА ПЫТАННЯ ЖАНОЧАГА СЯЛЯНСКАГА ПРАТЭСТУ ГВАЛТОЎНАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА 1940-Х – ПАЧАТАК 1950-Х ГГ.)


*І.У. Нікалаева*
*Віцебск, Міжнародны ўніверсітэт "МІТСО"*


Палітыка савецкай улады на вызваленай ад нацысцкай акупацыі тэрыторыі Беларусі з самых першых дзён была накіравана на максімальна хуткае аднаўленне эканамічных магчымасцяў сельскай гаспадаркі. Ва ўсходніх раёнах рэспублікі адразу па меры вызвалення краіны адбывалася аднаўленне калгасаў, якое ўспрымалася натуральна, хоць і далёка незаўсёды станоўча. Наяўнасць сярод сялян антыкалгасных настрояў была звязана ў тым ліку з негатыўным вопытам, атрыманым у калгасах да Вялікай Айчыннай вайны. У далучаных да БССР толькі восенню 1939 г. заходніх раёнах, дзе да пачатку вайны калектывізацыя закранула толькі нязначную частку гаспадарак, да пачатку 1949 г. задача правядзення суцэльнай калектывізацыі не ставілася, аднак савецкі ўрад выстройваў палітыку ў адпаведнасці з курсам на актыўную падтрымку калгаснага будаўніцтва. Значная ж частка сялян Заходняй Беларусі рашуча запрацівілася спробам калектывізаваць вёску, прычым нярэдка жанчыны адыгрывалі больш актыўную ролю ў процідзеянні калектывізацыі і антыкалгасных пратэстных акцыях. Аднак, калі яшчэ савецкія даследчыкі ў адпаведнасці з афіцыйнай ідэалагічнай дактрынай акцэнтавалі ўвагу на фактах пракалгаснай дзейнасці сельскіх актывістак (агітацыя, падтрымка масавых гаспадарча-палітычных кампаній і г.д.). Жаночыя антыкалгасныя акцыі пратэсту,



Репозиторий ВГУ

наадварот, прыцягвалі значна меншую ўвагу даследчыкаў і да гэтага часу не сталі прадметам спецыяльнага вывучэння ў айчыннай гістарыяграфіі.

Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца аналіз асаблівасцяў пратэсту жанчын гвалтоўнай калектывізацыі і негатыўным момантам калгаснай рэчаіснасці другой паловы 1940-х – пачатку 1950-х гг. у заходніх раёнах Беларусі.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне ажыццяўлялася на аснове інфармацыйнай і справаздачнай дакументацыі камітэтаў КП(б)Б, якая змяшчаецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўным архіве Віцебскай вобласці. Метадалагічны інструментарый, выкарыстаны ў рабоце, уключае ў сябе, як універсальныя (агульнанавуковыя), так і спецыяльнагістарычныя метады даследавання (гісторыка-параўнальны, гісторыка генетычны, метад гістарычнай рэтраспекцыі).

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Ва ўмовах пасляакупацыйнай разрухі ўлады не сталі фарсіраваць у заходніх раёнах рэспублікі палітыку калектывізацыі, перапыненую вайной. Ва ўмовах аднаўлення сельскай гаспадаркі заходніх абласцей першачарговая ўвага надавалася агітацыйна-прапагандысцкім мерам па схіленню сялян да добраахвотнага ўступлення ў калгасы. Пры гэтым партыйна-савецкія кіруючыя работнікі асаблівае месца адводзілі працы сярод жанчын-сялянак, якія ў выніку ваенных страт складалі тады асноўную частку сельскіх жыхароў і, як зазначалася ў інфармацыйных паведамленнях, з'яўляліся "найбольш адсталымі ў палітычных і культурных адносінах" і таму ў першую чаргу схільнымі да ўплыву "класава-варожых элементаў" [1, арк. 513].

Для таго, как мэтанакіравана ўздзейнічаць на жанчыночае насельніцтва, улічваючы вопыт 1920-х гадоў, 18 снежня 1945 г. бюро ЦК КП(б)Б прыняло рашэнне стварыць у райкамах, гаркамах і абкамах партыі заходніх абласцей і ЦК КП(б)Б аддзелы па рабоце сярод жанчын, асноўным зместам працы якіх, стала ўцягванне жанчын у грамадскую вытворчасць і палітыка-маральнае выхаванне ў духу сацыялістычнай ідэалогіі [2, арк. 14]. Зноў запатрабаванымі ў заходніх абласцях Беларусі ў пасляваенны час сталі таксама делегацкія сходы як адна з формаў далучэння жанчын да актыўнага грамадскага і палітычнага жыцця. Працу па арганізацыі делегатскіх сходаў праводзілі жанаддзелы, якія распачалі ўжо з лета 1946 г. падрыхтоўку выбараў делегатак па ўсіх раёнах заходніх абласцей [3, арк. 1]. Аднак дзейнасць па арганізацыі калгаснага будаўніцтва стала самай складанай у практыцы аддзелаў па рабоце сярод жанчын. Дакладныя запіскі і паведамленні па сітуацыі ў раёнах канстатуюць, што жанарганізатары ў сваёй дзейнасці па стварэнні калгасаў сутыкаліся з шэрагам цяжкасцяў. Нягледзячы на правядзенне актыўнай прапаганды калгаснага ладу, рэакцыя жанчын на сацыялістычны перабудову вёскі была неадназначнай.

Пэўная частка жаночага насельніцтва больш ці менш актыўна выступіла ў падтрымку калгаснага будаўніцтва, прымаючы ўдзел ў масавых грамадска-палітычных мерапрыемствах (жаночых сходах, канферэнцыях і г.д.). Такая пазіцыя была абумоўленая не толькі мерапрыемствамі па эмансіпацыі жанчын, якая мэтанакіравана ажыццяўлялася савецкай уладай, але і тым, што многія сельскія актывісткі бачылі ў калгасах адзінае выратаванне ад галечы і беднасці. Адзінокія і аўдавелыя сялянкі (многія з якіх па прычыне склаўшайся палавой дыспрапорцыі былі пазбаўленыя патэнцыйных шлюбных партнёраў) такім чынам маглі спадзявацца на падтрымку ад калектыўнай гаспадаркі і мінімізаваць залежнасць ад мужчын.

Аднак чакалі ад калгасаў змен да лепшага далёка не ўсе, перакананні агітатараў "у перавагах калгаснага ладу перад аднаасобнай гаспадаркай" выклікалі скепсіс у большасці жанчын, якія часта ў адказ на прапановы арганізаваць калгас проста пакідалі сходы і разыходзіліся па хатах [4, арк. 537]. У той час, калі асобныя сельскія жанчыны дэманстравалі пасіўнасць, абыякавасць да мерапрыемстваў савецкай улады ў справе калгаснага будаўніцтва, іншыя публічна выказвалі непрыманне аграрных пераўтварэнняў савецкай улады. Як адзначалася ў дакладных запісках па стане работы сярод жанчын, нават сярод делегатак сустракаліся "антыкалгасна настроеныя", якія самі "не хочуць уступаць у калгас і на сходах крычаць больш за астатніх супраць калгасаў" [5, арк. 7].

Аднак вусным выказваннем незадаволенасці пратэст не абмяжоўваўся. Пасля таго, як у лютым 1949 г. XIX з'езд КП(б)Б прыняў пастанову аб неабходнасці суцэльнай калектывізацыі краіны і завяршэння калгаснага будаўніцтва ў заходніх абласцях БССР, ігнараванне прынцыпу дабраахвотнасці стала неад'емнай часткай прыцягнення сялян ў калгасную вытворчасць.



Репозиторий ВГУ

Прымяненне метадаў грубых загадаў, выпадкі адміністравання і ў цэлым арганізацыя калгасаў “зверху” спараджалі не толькі негатыўную рэакцыю на калгасны лад, але і актыўнае процідзеянне сялянак. Крыніцы, датаваныя 1949–1950 гг., утрымліваюць нямала прыкладаў, якія адлюстроўваюць напружанасць эмоцый, гэтак уласцівых жаночым масавым выступленням. Так, у в. Смонічы Маладзечанскай вобласці звыш 40 жанчын, усяляк праклінаючы калгас і саветы, лажыліся пад трактар, які выехаў правесці агульнае ўзворванне поля [5, арк. 11]. У другім калгасе група жанчын перашкодзіла калектыўнай уборцы ўраджаю, збіўшы мужчын, якія працавалі на жняярцы. Характэрным з’яўляецца выпадак у в. Андрэеўцы Свірскага раёну, дзе жанчыны ўзламалі калгасны свіран і разнеслі зерне па хатах [6, с. 26].

І хоць калектыўныя формы выступлення жанчын успрымаліся з меншай палітызацыяй, адпаведныя органы адзначалі, што жанчыны праяўлялі асаблівую актыўнасць, быўшы найбольш схільнымі да ўплыву правакацыйных антысавецкіх чутак і настрояў [5, арк. 7]. Такім чынам, партыйныя функцыянеры тлумачылі прычыны меўшых месца фактаў жаночых пратэстаў перш за ўсё падрыўной дзейнасцю класавых ворагаў, а не актыўным выкарыстаннем метадаў прымусу ў ходзе стварэння калгасаў і негатыўнымі момантам калгаснай рэчаіснасці (дрэнная арганізацыя працы, абуральная безгаспадарчасць і г.д.).

На працягу наступных гадоў пратэст сельскіх жанчын супраць адмоўных кампанентаў і характарыстык калгаснай сістэмы выяўляўся ў пасіўных формах, пераважна ва ўхіленні ад удзелу ў грамадскай вытворчасці. Прысутная ў архіўных матэрыялах інфармацыя сведчыць, што распаўсюджанай была сітуацыя, калі жанчыны, якія ўступілі ў калгас, на працу не выходзілі і не выпрацоўвалі ніводнага працадня [7, арк. 155 ; 8, арк. 175].

**Заключэнне.** Уяўляецца магчымым канстатаваць, што антыкалгасная актыўнасць сялянак цалкам укладвалася ў агульнае рэчышча супраціву сельскіх жыхароў Заходняй Беларусі палітыцы гвалтоўнай калектывізацыі другой паловы 1940-х – пачатку 1950-х гг. Разам з тым, жанчыны часта адыгрывалі больш актыўную ролю ў пратэстным руху, чым мужчыны. Гэта было абумоўлена не толькі склаўшымся пасля вайны значным колькасным пераважаннем жанчын сярод дзеяздольнага сельскага насельніцтва, але вынікала таксама з сутнасных характарыстык жаночай ментальнасці. Жанчыны былі менш схільныя, чым мужчыны, да ўдзелу ў мерапрыемствах савецкай улады, аказваючы процідзеянне любым спробам звонку зламаць традыцыйны сельскі ўклад і зрабіць пэўны замах на дамашні ачаг. Нарэшце, з завяршэннем к 1952 г. кампаніі па калектывізацыі ў заходніх раёнах БССР, жанчыны-калгасніцы не жадалі мірыцца з заганамі гаспадарчай арганізацыі калгаснай сістэмы і дэманстравалі сваю незадаволенасць і нязгоду са склаўшайся рэчаіснасцю.

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4-п. Воп. 20. Спр. 221.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4-п. Воп. 49. Спр. 16.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4-п. Воп. 49. Спр. 11.
4. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Ф. 10060-п. Воп. 1. Спр. 320.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4-п. Воп. 49. Спр. 21.
6. Курков, И. Гендерный строй белорусской деревни в 20-е гг. / И. Курков // Иной взгляд : Международный альманах гендерных исследований. – Мн., 2000. – Март. – С. 25–26.
7. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4-п. Воп. 49. Спр. 32.
8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4-п. Воп. 49. Спр. 25.

## МУЗЕИ В ПЕРИОД ПАНДЕМИИ: ПЕРСПЕКТИВНЫЕ ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ

*А.Ю. Папроцкая*
*Витебск, Витебский областной краеведческий музей*

Пандемия короновируса не могла не сказаться на пространстве современного музея. Многие из них либо полностью прекратили свою деятельность, либо ушли в онлайн-формат. После долгих месяцев карантина стало абсолютно очевидным, что музеи, которые продолжали вести активную онлайн-работу, открывая выставки и экспозиции для виртуального просмотра и работая с потенциальной аудиторий, стали все более востребованными для посетителя. Несмотря на многочисленные сложности, с которыми столкнулась сфера культуры во время пандемии, можно выделить и ряд перспективных направлений деятельности в развитии музея как социокультурного института.



Репозиторий ВГУ